КАНТРОЛЬНЫ ЭКЗЕМПЛЯР

Установа вышэйшай адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
________________ А.В.Макоўчык
"____" ____________ 2019 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-22 / вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:**

1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой праграмы "Беларуская дыялекталогія", 20.10.2014 г. Рэгістрацыйны нумар № ТД – А. 514 / тып. і вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура; 1 – 02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Ю.В. Чарнякевіч, старшы выкладчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Прыгодзіч М.Р., загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;

Шклярык В. А., навуковы супрацоўнік аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 9 ад 19.04.2019 г.)

Загадчык кафедры ________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы вышэйшай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

(пратакол № 6 ад 10.06.2019)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага

аддзела БДПУ ________ С.А.Старадуб

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Беларуская дыялекталогія” – вучэбная дысцыпліна, якая знаёміць з вынікамі даследавання дыялектнай мовы і раскрывае асноўныя заканамернасці яе функцыянавання, паказвае найважнейшыя асаблівасці беларускай дыялектнай мовы на ўсіх ўзроўнях моўнай сістэмы ў структурна-тэрытарыяльных разнавіднасцях, тлумачыць сувязь і агульныя рысы з сістэмай літаратурнай мовы, прадстаўляе сістэму навуковых паняццяў гэтай лінгвістычнай галіны і асноўныя дасягненні ў даследаванні народных гаворак.

Праграма “Беларуская дыялекталогія” дапаможа студэнтам сістэматызаваць набытыя веды пры вывучэнні іншых лінгвістычных дысцыплін, навучыць будучых настаўнікаў заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі вучняў, у тым ліку абумоўленыя ўплывам дыялектнага маўлення і праблемамі білінгвізму ў краіне.

**Асноўныя мэты выкладання вучэбнай дысцыпліны:**

– сфарміраваць у будучых настаўнікаў уяўленне пра беларускую нацыянальную мову ва ўсёй разнастайнасці формаў яе існавання;

– развіць практычныя навыкі выяўляць і назіраць дыялектныя асаблівасці ў мове жыхароў пэўнай мясцовасці, запісваць і аналізаваць канкрэтны дыялектны матэрыял;

– пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй станаўлення і этапамі развіцця беларускай дыялекталогіі і яе асноўнымі дасягненнямі;

– выхаваць любоў і павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны:**

– пазнаёміць студэнтаў з сістэмай навуковых паняццяў, прынятай у беларускай дыялекталагічнай навуцы, і метадамі дыялекталагічных даследаванняў;

– выпрацаваць навыкі апрацоўкі і аналізу асаблівасцей дыялектнай мовы;

– навучыць методыцы палявых даследаванняў і запісу асаблівасцей дыялектнай мовы, у тым ліку і з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў;

– паказаць сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– падрыхтаваць будучага настаўніка роднай мовы да самастойнай працы ва ўмовах мясцовага дыялекту.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый*.

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

АК-7. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Студэнт павінен:

САК-7. Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчыцкай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі разнастайных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную працу навучэнцаў.

ПК-8. Фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы навучэнца.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай працы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і іншымі крыніцамі інфармацыі.

ПК-16 – ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– сувязь дыялекталогіі з рознымі раздзеламі беларускага мовазнаўства і іншымі гуманітарнымі навукамі;

– гісторыю станаўлення і этапы развіцця беларускай дыялекталогіі;

– асноўныя дасягненні айчынных навукоўцаў у галіне беларускай дыялектнай лексікаграфіі, фразеаграфіі і лінгвагеаграфіі;

– групоўку беларускіх гаворак, асноўныя асаблівасці асобных дыялектаў і груп гаворак на ўсіх узроўнях мовы;

– асаблівасці фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы на аснове народных гаворак;

– навуковую, вучэбную і даведачную літаратуру па дадзенай галіне мовазнаўчай навукі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– збіраць, апрацоўваць, класіфікаваць і аналізаваць дыялектны матэрыял;

– параўноўваць моўную сістэму гаворкі з сістэмай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях;

– выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі для збірання, апрацоўкі і аналізу моўных фактаў;

– складаць дыялектны слоўнік і лінгвістычную карту;

– выкарыстоўваць метады, прыёмы , сродкі і формы навучання роднай мове ў дыялектным асяроддзі;

– карыстацца навуковай, вучэбна-метадычнай і даведачнай літаратурай па беларускай дыялекталогіі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– сістэмай навуковых паняццяў беларускай дыялекталогіі;

– метадамі дыялекталагічных даследаванняў і методыкай збіральніцкай працы;

– методыкай выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах;

– навыкамі арганізацыі навуковай дыялекталагічнай працы вучняў і кіравання дыялекталагічным гуртком.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін.*

У сістэме лінгвістычных дысцыплін “Беларуская дыялекталогія” на філалагічных факультэтах са спецыяльнасцю “беларуская мова” займае важнае месца. Вучэбны курс працягвае цыкл лінгвістычных дысцыплін і мае цесную сувязь з курсамі “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Беларуская анамастыка”, “Беларуская лінгвакультуралогія”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Вучэбная дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Сучасная беларуская літаратурная мова”, “Беларуская анамастыка”, “Беларуская лінгвакультуралогія”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Уводзіны ў мовазнаўства”, а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Лекцыйныя і практычныя заняткі накіраваны на выяўленне лінгвістычных і культуралагічных аспектаў беларускай мовы, што з’яўляецца надзвычай важным ва ўмовах білінгвізму.

Вучэбная дысцыпліна чытаецца на 1 курсе ў 2-м семестре. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура ўсяго адводзіцца 72 гадзіны. Аўдыторных 42 гадзіны, з іх 20 – лекцыйных і 22 – практычных, самастойная работа 30 гадзін. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны для спецыяльнасці 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова ўсяго адводзіцца 84 гадзіны. Аўдыторных 42 гадзіны, з іх 20 – лекцыйных і 22 – практычных, самастойная работа 42 гадзіны.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін на дзённым аддзяленні:*

*на 1 курсе*: 2 семестр:

Усяго: 84 гадзін, аўдыторных – 42 гадзіны.

Лекцыі – 20 гадзін (з іх 2 гадзіны КСР).

Практычныя заняткі – 22 гадзіны (з іх 4 гадзіны КСР).

Самастойная праца – 42 гадзіны. Вылучыць на: тэму 2.1 – 2 г., тэму 2.2 – 2 г., тэму 3 – 8 г., тэму 4.1. – 4 г., тэму 4.2. – 4 г., тэму 4.3 – 4 г.*, тэму 4.4 – 4 г.*, тэму 5.1 – 2 г., тэму 5. 2 – 2 г., тэму 6.1.– 8 г., 6.2 – 4 г.* .

* Темы прызначаны для навучэнцаў спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне (2 семестр) – **залік.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны.** Прадмет, змест і задачы курса "Беларуская дыялекталогія", яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі. Навукова-тэарэтычнае значэнне дыялекталогіі. Сувязь дыялекталогіі з іншымі навукамі: лінгвістычнымі – гісторыяй мовы, сучаснай беларускай літаратурнай мовай, анамастыкай; нелінгвістычнымі – гісторыяй, этнаграфіяй, археалогіяй, фалькларыстыкай, літаратуразнаўствам, краязнаўствам.

Практычнае значэнне вывучэння дыялекталогіі пры авалоданні нормамі беларускай літаратурнай мовы. Выкарыстанне фактаў дыялекталогіі ў выкладанні курса беларускай мовы ў школе.

Выхаваўчае значэнне дыялекталогіі ў фарміраванні маўленчай культуры асобы.

**2. Дыялекталогія як раздзел мовазнаўства.**

*2.1. Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы.* Апісальная (сінхранічная, статычная) і гістарычная (дыяхранічная) дыялекталогія.

Сістэма навуковых паняццяў у дыялекталогіі: гаворка, група гаворак (дыялектная група), дыялект, дыялектная мова, дыялектнае маўленне, сістэма дыялектнай мовы, структура дыялектнай мовы і інш.

Тэрытарыяльныя (мясцовыя) дыялекты. Сацыяльныя дыялекты (прафесійныя дыялекты і жаргоны – тайныя жаргоны, жаргоны дваранскіх салонаў, групавыя або карпаратыўныя жаргоны, шляхецкі жаргон і інш.), сфера іх выкарыстання.

Асноўныя раздзелы дыялекталогіі: фаналогія, граматыка, лексікалогія, лексікаграфія, лінгвагеаграфія, аб'екты іх даследаванняў.

Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фалькларыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст. (друкаваныя, рукапісныя, магнітафонныя, лічбавыя), дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш.

Метады даследавання дыялектнай мовы. Непасрэднае назіранне – асноўны метад вывучэння дыялектнай мовы. Анкетны метад. Экспедыцыйны метад. Умовы і формы арганізацыі дыялекталагічных экспедыцый. Экспедыцыйны метад як асноўны і найбольш надзейны пры збіранні дыялектных матэрыялаў. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне.

Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў.

*2.2. З гісторыі беларускай дыялекталогіі.* Станаўленне і развіццё беларускай дыялекталогіі (XIX – пачатак XX ст.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак на розных моўных узроўнях у фальклорных і этнаграфічных працах першай паловы XIX ст. П.Шафарыка, З.Даленгі-Хадакоўскага, Я.Чачота, П.Шпілеўскага, І.Шыдлоўскага, П.Кушына, М.Дзмітрыева і інш. Першыя спробы вызначэння межаў беларускай дыялектнай мовы, характарыстыкі і класіфікацыі гаворак у іх працах.

Апісанне характэрных фанетычных і марфалагічных асаблівасцей беларускіх гаворак, публікацыі асобных мясцовых слоў, падборак фразеалагізмаў і невялікіх слоўнікаў у працах этнографаў і фалькларыстаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.: паўночна-ўсходніх – П.Шэйна, Віцебшчыны – Н.Анімеле, Магілёўшчыны – Е.Раманава, Міншчыны – М.Янчука, Случчыны – С.Малевіча і А.Сержпутоўскага, Піншчыны – М.Доўнар-Запольскага, заходніх рэгіёнаў Беларусі – М.Федароўскага, Смаленшчыны – П.Шастакова.

Лінгвістычнае даследаванне гаворак беларускай мовы. Першыя спробы сінтэзу дыялектнага матэрыялу ў працах М.Коласава, К.Апеля, І.Нядзёшава, А.Сабалеўскага, А.Шахматава і інш. Грунтоўнае навуковае апісанне беларускай дыялектнай мовы ў працах Я.Карскага: "Обзор звуков и форм беларусской речи" (1885), "Белорусы" (т.1, 1903; т.2, 1908-1912), "Русская диалектология" (1924), складзеная ім "Программа для собирания особенностей белорусского наречия" (1897). "Этнографическая карта белорусского племени" (1903) – першая карта пашырэння беларускай мовы. Значэнне даследаванняў Я.Карскага ў распрацоўцы разнастайных праблем беларускай дыялекталогіі.

Развіццё беларускай дыялекталогіі ў паслякастрычніцкі перыяд. Камісія Інбелкульта (1925) па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы, вынікі яе дзейнасці.

Працы І.Ваўка-Левановіча, П.Растаргуева, П.Бузука, С.Некрашэвіча па розных пытаннях беларускай дыялектнай мовы.

Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд. Манаграфічнае апісанне розных узроўняў беларускай дыялектнай мовы ў працах Ю.Мацкевіч, Н.Вайтовіч, Ф.Янкоўскага, І.Гайдукевіча, С.Грыгор’ева, І.Зянько, Я.Рамановіч, Т.Сцяшковіч, Д.Целянцюка, Б.Яфімава, Ф.Клімчука, І.Яшкіна, А.Чабярук, П.Сцяцко, М.Бірылы, А.Крывіцкага, К.Панюціч, Э.Блінавай, А.Станкевіч, Г.Вештарт, І.Лучыца-Федарца, Л.Выгоннай, А.Сакалоўскай і інш.

Вывучэнне беларускай дыялектнай мовы замежнымі навукоўцамі (Л.Асоўскі, Э.Смулкова, М.Лесеў, Ф.Чыжэўскі, М.Саевіч, С.Глінка, М.Кандрацюк, В.Курашкевіч (Польшча), А.Грынавецкене (Літва), М.Талстой, С.Талстая (Расія), М.Нікарчук, А.Залескі, П.Грыцэнка, Я.Закрэўская, Й.Дзендзялеўскі (Украіна) і інш.).

Праграмы, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Лінгвістычная геаграфія.** Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт (карта асобных моўных з'яў і некалькіх моўных з'яў або зводная). Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны ("Дыялекталагічны атлас беларускай мовы"), б) тэматычны ("Лексічны атлас беларускіх народных гаворак"); у залежнасці ад тэрыторыі даследавання:
а) агульнанацыянальны ("Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак"),
б) рэгіянальны ("Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны", "Атлас усходнеславянскіх гаворак Беласточчыны"), в) атласы груп моў ("Агульнаславянскі лінгвістычны атлас"), г) сем'яў моў ці кантынентаў ("Лінгвістычны атлас Еўропы"). Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў.

З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі.

**4. Групоўка беларускіх гаворак.**

*4.1. Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў.* Першыя спробы падзелу гаворак беларускай мовы на групы (П.Шафарык, Я.Чачот, І.Насовіч, А.Сабалеўскі, А.Шахматаў). Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты – значнае дасягненне беларускай дыялекталогіі. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй (1915). Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы.

Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы" (1963). Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны).

*4.2. Паўночна-ўсходні дыялект.* Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская).

*4.3. Паўднёва-заходні дыялект.* Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце.

Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі).

*4.4. Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі.* Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.

Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны.

**5. Беларуская дыялектная мова.**

*5.1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка.* Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях: колькасць часцін мовы, тыпы сказаў, род, лік, склон, скланенне, спражэнне, час, асоба і інш. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць.

Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы: аканне, яканне, дзеканне, цеканне, цвёрдыя шыпячыя і р, фрыкатыўны г і інш.

Тры тыпы тэрытарыяльных адрозненняў на фанетычным узроўні: а) па інвентары (колькасці) фанем, б) па якасці фанем, в) па характары пазіцыйных змен.

Шасціфанемная і васьміфанемная вакалічныя сістэмы беларускай дыялектнай мовы. Тэрытарыяльна абмежаваныя ў гаворках фанемы /ô/ (закрытая) і /ê/ (закрытая), фанетычныя ўмовы іх узнікнення.

Супрацьпастаўленне санорных /р/ і /р'/, афрыкат /дз'/, /ц'/ і змычных /д(д')/, /т(т')/, шыпячых /ж/ і /ж'/, /ч/ і /ч'/, /ш/ і /ш'/, /дж/ і /дж'/, свісцячых /ц/ і /ц'/ у беларускіх гаворках.

Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя – змяненне этымалагічнага (ы) на (у) пасля губных (*буў, вурасло, му*); змяненне (а) на (о) перад [ў] (*броў, гулёў, зоўтра*). Чаргаванне галосных /е/ – /о/ (*цешча і цёшча, далеко і далёка*) і інш.

Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Пазіцыйныя змяненні ненаціскных галосных пад уздзеяннем зычных (*бузар, куваль, пубраў*) і галосных суседніх складоў (*балы, дукумент, патанне*).

Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных – аканне і оканне. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Дысімілятыўнае аканне з элементамі асіміляцыі. Поўнае і няпоўнае недысімілятыўнае аканне. Поўнае недысімілятыўнае аканне – арфаэпічная норма беларускай літаратурнай мовы.

Оканне. Гіпероканне – вымаўленне [о] на месцы этымалагічнага [а] у асобных гаворках (*довай, трова*). Вымаўленне на месцы этымалагічнага [о] гука [у] (*вуда, снупы*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вакалізм пераходнага (змешанага) тыпу. Дысімілятыўна-недысімілятыўнае аканне. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем.

Галосныя ў пачатку слова. Адпадзенне галосных і яго прычыны (*на гню, хто'ткул*). З'яўленне галосных у пачатку слова (*аралля, апалонка*).

Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля мяккіх зычных – яканне і еканне. Дысімілятыўнае яканне, віцебскае яканне як яго разнавіднасць. Недысімілятыўнае яканне, поўнае і няпоўнае. Недысімілятыўнае няпоўнае яканне – арфаэпічная норма сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Еканне. Асаблівасці яго праяўлення ў заходнепалескіх гаворках (*вэсна, сэстра, зымля, гныздо*).

Рэшткі цокання ў асобных гаворках паўночнага ўсходу Беларусі.

Прыстаўныя зычныя /в/, /г/, асаблівасці іх ужывання ў дыялектнай мове (*вуха, возяра, гарэх, гануча, гуліца, вакно*). Адсутнасць прыстаўных /в/, /г/ у некаторых гаворках (*озеро, око, ухо*).

Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет: варыянтнасць губных (*каблук – камлук, помніць – поўніць, бульба – бульва, фортка – хвортка* і інш.); варыянтнасць пярэднеязычных (*серы – шэры, цапля – чапля, лядашчы – лядашты, супонь – цупонь, багуннік – багуднік* і інш.); варыянтнасць заднеязычных (*закутаць – захутаць, рэшта – рэхта* і інш.); варыянтнасць шумных, аднолькавых паводле спосабу утварэння (*тырса – кірса, вырай – гырэй*); варыянтнасць санорных (*неріт – мерет, грузд – глузд, вымя – лымя*); варыянтнасць звонкіх і глухіх зычных (*плуска – блуска, мыза – мыса, цвік – дзвік*); варыянтнасць цвёрдых і мяккіх (*бадзяк – бадак, мянтуз – мантуз*).

Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет (*плюшнік – плішнік, дзірка – дзюрка, ажымкі – ажэмкі, занудзіць – заныдзіць, курган – кургон, дзюжыць – дзяжыць*).

Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза галосных (*корак – акорак, кмен – укмен, змрок – ізмрок*).

Пратэза зычных (*Андрэй – Яндрэй, іней – віней, іншы – гіншы, ячая – лячая, ажыны – важыны, аранне – гаранне, ануча – гануча, адуванчык – надуванчык, рапуха – хропуха, цень – сцень, асны – дзясны*).

Адпадзенне пачатковых фанем (*алешнік – лешнік, асіна – сіна, ікра – кра, галялёд – алялёд, зверабой – верабой, якраз – акраз, смаршчок – маршчок, красуе – расуе*).

Эпентэза галосных (*клоп – калоп, чэрпаць – чарэпаць*) і зычных фанем (*шуга – шурга, ажавіннік – аржавіннік, цяміць – цямніць, ахотнік – ахвотнік, кролік – кроглік, баня – байня*).

Дыярэза галосных (*баранаваць – барнаваць, спарыня – спарня, пагібаць – пагбаць*), зычных (*агрэх – арэх, гвоздзь – гоздь, высквaркі – вускаркі*) і складоў (*калаваротка – каваротка, галамутыть – гамутыть*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Метатэза фанем: метатэза галоснай і зычнай (*кракавінне – каркавінне, громада – гормада, глыток – галток, гарабіна – аграбіна*), зычных фанем (*жаўранак – жарванак, бондар – боднар, нагбом – набгом, рудлёўка – людроўка, серадольшы – селядоршы, дзяруга – радзюга*) і складовая (*лупаваты – валупаты*).

Прыпадабненне (асіміляцыя) звонкіх да глухіх (*галупка, сцешка, ніска*), адсутнасць асіміляцыі звонкіх да глухіх у частцы гаворак (*цяжка, бабка, лодка*). Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова (*дуп, стох, нош*), адсутнасць аглушэння ў частцы гаворак (*зуб, рог, вуж*). Асіміляцыя шыпячых да свісцячых (*вучысся, смяйесся*).

*5.2. Марфалогія. Сінтаксіс. Лексіка. Фразеалогія.*

Назоўнік. Адрозненні ў формах роду (*вялікая стада – вялікае стадо, мой метр – мая метра*). Адрозненні ў катэгорыі ліку (*плоскані – плоскунь, казлы – казёл* 'сажань', *калапні – калапня* 'каноплі'). Рэшткі формаў парнага ліку назоўнікаў у паўднёва-заходніх гаворках (*дзвê назê, дзвê хацê, дзвê вядрэ, ушыма, вачыма, у вушшу, у ваччу*).

Скланенне назоўнікаў у адзіночным ліку. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду: больш шырокае ўжыванне формы роднага склону з канчаткам -у (*мосту, савету, каля Слуцку*); формы назоўнікаў давальнага і меснага склонаў на -ові (-овы) (*хлопцаві (хлопцёвы), чоловекові (чоловіковы), пры братові (братовы), в кожухові (в кожуховы*); варыянтнасць канчаткаў меснага склону ў беларускіх гаворках (*у кажуху, у кажусе, у лесі, у цабрэ, у роця* і інш.) Форма клічнага склону (*тато! дзядзько! голубе! сынку! Сцяпане*).

Дыялектныя адрозненні назоўнікаў жаночага роду: родны склон (*была ў сястрэ, да дачке, да зямлі, з ліпу, ад галаву*), давальны склон (*вадзе, воді, мамы, хаця, бабі*), месны склон (*на назê, на горэ, на голові, на вайны, на спіны, на дарозя, пры фермі*).

Асаблівасці скланення назоўнікаў жаночага роду з нулявым канчаткам тыпу *мыш, гусь* і пад.

Дыялектныя адрозненні назоўнікаў з суфіксам -онак (-ёнак), якія абазначаюць маладых істот. Скланенне назоўнікаў на -мя, а таксама назоўнікаў *маці, свякроў* у розных гаворках. Асаблівасці скланення назоўнікаў мужчынскага роду на -а (-я) (*дзядзька (дзядзько), тата (тато*).

Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Агульнаўжывальныя і дыялектныя канчаткі назоўнікаў (*дубэ, кашэ; дзяўке, сарачке; сёла, вокна; братом, па лугох; дубамі, людзьмі, граблямы, з рукам*).

Займеннік. Дыялектныя адрозненні ў скланенні займеннікаў: формы асабовых і асабова-ўказальных займеннікаў *я*, *ты*, *мы* (*му*), *вы* (*ву*, *вітэ*), *ён* (*вон*, *він*, *вôн*), *яна* (*вона*), *яно* (*воно*), *яны* (*воны*). Семантычныя адрозненні і скланенне ўказальных займеннікаў *той*, *гэты*, *гэны*. Склонавыя формы прыналежных займеннікаў *мой*, *твой*, *свой*. Прыналежныя займеннікі *ягоны*,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*ейны, іхны* (*іхні*), *усіхны*. Няпэўныя займеннікі з постфіксамі -сці, -ль, -та, -небудзь і прыстаўкай абы-.

Прыметнік. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў у беларускіх гаворках. Дыялектныя адрозненні скланення прыметнікаў у адзіночным ліку. Скланенне прыметнікаў у множным ліку. Злітыя (сцягнутыя) канчаткі ў формах прыметнікаў. Утварэнне формаў ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай дыялектнай мове.

Лічэбнік. Дыялектныя формы ўласна колькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў. Асаблівасці скланення колькасных і парадкавых лічэбнікаў у гаворках. Злітыя (сцягнутыя) канчаткі ў парадкавых лічэбніках.

Дзеяслоў. Формы інфінітыва на -ць, -ці (-ты) пасля асновы на галосны (*рабіць, хадзіць, рабіці, хадзіці, робыты, ходыты*)*;* на -ці (-ць) пасля асновы на зычны (*прасці, несці, прасць, несць*)*;* на -чы (-ці, -ч) пасля асновы на заднеязычныя [г], [к] (*бегчы, таўчы, бегці, таўкці, бегч, тоўч).*

Варыянты постфікса -ся ў зваротных дзеясловах: -ся, -сі, -се, -сь -сё, -са, -со, -сэ, -с.

Дыялектныя асаблівасці ў асновах дзеясловаў. Адсутнасць – наяўнасць чаргавання ў аснове на заднеязычны (*сяку, сякеш (сячэш), сякець (сячэць*). Наяўнасць – адсутнасць шыпячага ў асабовых формах дзеясловаў з асновай на заднеязычны (*сцеражу (сцерагу), сцеражэш, сцеражэ*). Зацвярдзенне зычнага асновы ў форме першай асобы множнага ліку (*ідом, пойдам*). Асаблівасці чаргавання ў дзеясловах з асновай на губны зычны (*любіць, люблю, любліш*).

Дыялектныя адрозненні ў спражэнні дзеясловаў. Формы трэцяй асобы адзіночнага ліку першага і другога спражэння з -ць і без -ць (*ідзець, ідзе; просіць, носіць, прося, косе*). Формы першай асобы множнага ліку (*нясём, нясем, нясемо, нысэмо*). Канчаткі другой асобы множнага ліку (*бераце, берацё, бярэце, бырытэ*). Формы трэцяй асобы множнага ліку першага і другога спражэнняў (*ходзяць, ходзюць, кажаць, кажуць*).

Формы будучага складанага часу. Сінтэтычная (злітная) форма (*гаварыцьму, гаварыцьмеш, гаварыцьме, гаварыцьмем, гаварыцьмеце, гаварыцьмуць*). Складаная форма прошлага часу ў гаворках (*яна была пайшоўшы*).

Дыялектныя адрозненні ў формах загаднага ладу дзеясловаў (*кладзі, кладзіка (кладзітка), кладзіце, кладзеце (кладзеця), ляшча, намашча, нясем, касем, сядзьма, кіньма, жнімо, ідзімо* і інш.).

Прыслоўе. Дыялектныя асаблівасці ў спосабах утварэння прыслоўяў: ад назоўнікаў (*духном* 'хутка'*, сілом, далавах* 'унізе'*, пазагораю*)*;* ад прыметнікаў (*горно, дзіўне*); ад займеннікаў (*кадзе*); ад лічэбнікаў (*удзвейгу, паперва*); ад дзеясловаў (*прыскакам, прыхваткам, бегма*); ад прыслоўяў (*замала, задужо*). Дыялектныя асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў.

Дыялектныя асаблівасці ў складзе і спосабах утварэння прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц.

Акцэнтныя асаблівасці розных часцін мовы ў беларускіх гаворках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сінтаксіс. Дыялектныя асаблівасці ў структуры словазлучэнняў. Беспрыназоўнікавыя словазлучэнні (*купіў гармоніка, прывезлі гасцінца; пасвіў каровы, пагадаваў дзеці; гэтым годам, гэтай парой; ад работы не атхлынесса яму на хазяйсцве жывучы*).

Прыназоўнікавыя словазлучэнні (*паехаў у дровы, паехаў па дровы, паехаў за дравамі; пчала ляціць паўз нос (каля носу)* і інш.).

Дыялектныя адрозненні ў структуры простага сказа. Асаблівасці выражэння дзейніка ў двухсастаўных сказах (*трох прыйшло, двох хлопчыкаў бегаіць, коню ляціць*). Выражэнне выказніка ў простым сказе (*яны буракі пасадзіўшы, маці паехаўшы; была букет сабраўшы, была ўчадзеўшы* і інш.).

Дыялектныя адрозненні ў структуры складанага сказа.

Лексіка. Дыялектныя адрозненні ў лексіцы.

Агульнанародныя і дыялектныя словы ў лексіцы беларускіх гаворак. Асноўныя прыкметы дыялектнага слова. Дыялектныя словы ў розных семантычных групах традыцыйнай лексікі: назвы прадметаў хатняга ўжытку, сельскагаспадарчых прылад працы і іх частак, палявых культур, вопраткі, пабудоў, іх дэталей, раслін, жывых істот і інш.

Гістарычныя пласты ў лексіцы сучасных беларускіх гаворак.

Запазычаныя словы ў складзе дыялектнай лексікі (літуанізмы, паланізмы, германізмы, лацінізмы і інш.), іх адаптацыя ў беларускай дыялектнай мове.

Асноўныя тыпы дыялектных адрозненняў у лексіцы. Несупрацьстаўленыя лексічныя адрозненні. Супрацьстаўленыя лексічныя адрозненні: уласналексічныя (*плоская – плаўная – ложная – адхоная – пахілая – шлопая – слосная – простая – спаховістая – нястромкая – плыткая* 'пакатая (страха)'; этнаграфічныя *(цурка – клыбель* 'прылада для вязання снапоў'); лексіка-словаўтваральныя *(пагалоскі – адгалоскі – пагалос – водгаласкі* 'рэха'); лексіка-семантычныя *(жычка* 'чырвоная стужка' – *жычка* 'крапіва з дробным лісцем'); лексіка-фанематычныя *(журахвіны* – 'журавіны', *папераць* – 'папараць'); лексіка-граматычныя (*танка* ж.р. – 'танк'); акцэнталагічныя (*таўсты́* – 'тоўсты').

Лексіка-семантычныя сувязі ў сістэме гаворак. Полісемія. Аманімія. Сінанімія. Матываванасць дыялектных слоў.

Змены ў дыялектнай лексіцы, звязаныя з сучаснымі працэсамі развіцця тэрытарыяльных гаворак.

Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў: адсутнасць у літаратурнай мове (*кідацца да рук* 'вельмі моцна прасіць', *сівая жызня* 'цяжкае бязрадаснае жыццё'), семантычная адметнасць (*як мыш пад мятлой* 'ізалявана, адзінока'), наяўнасць у структуры фразеалагізма дыялектнага кампанента (*лье як у фарыну* 'п'е без меры', *борухі вадзіць* 'спаць седзячы').

Сінанімічнасць фразеалагізмаў (*качка стопча, кату па пяту, свінні па каўнер* 'вельмі малы'). Полісемія фразеалагізмаў (*да галавы браць* 'моцна

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

хваляваццa, турбаваццa, непакоіцца за што', 'запамінаць што, цікавіцца чым'). Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы.

**6. Дыялектная лексікаграфія і фразеаграфія.**

*6.1. Дыялектная лексікаграфія.* Дыялектная лексікаграфія (дыялектаграфія) як самастойны раздзел сучаснай беларускай апісальнай дыялекталогіі.

Мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання ў дыялектаграфіі.

Тыпы дыялектных слоўнікаў і прынцыпы іх укладання. Дыялектныя слоўнікі поўныя і дыферэнцыйныя. Слоўнікі дыялектызмаў з твораў пісьменнікаў.

Тры асноўныя этапы ў гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі.

Этнаграфічны этап, яго храналагічныя межы і асаблівасці. Першыя спробы збірання дыялектнай лексікі і іх навуковае значэнне (А.Меер, К.Калайдовіч, Я.Чачот, П.Шпілеўскі, І.Грыгаровіч, С.Мікуцкі і інш.).

Этналінгвістычны этап як састаўная частка агульнага апісання беларускай мовы. "Словарь белорусского наречия" (1870) І.Насовіча – першы грунтоўны слоўнік беларускай мовы. Лексікаграфічныя здабыткі З.Радчанкі, С.Малевіча, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава і інш. Лексікаграфічная спадчына Я.Карскага.

Дыялектаграфічны этап у гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі. "Смоленский областной словарь" (1914) У.Дабравольскага – першая праца гэтага тыпу. Праграма па складанні слоўнікаў беларускай мовы Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Краёвыя слоўнікі М.Каспяровіча, М.Шатэрніка, І.Бялькевіча, А.Крукоўскага.

Развіццё беларускай дыялектнай лексікаграфіі ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст. Асаблівасці лексікаграфічнай праграмы Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі і вынікі яе рэалізацыі.

Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных рэгіёнах.

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны. Лексіка Глушчыны ў "Дыялектным слоўніку" Ф.Янкоўскага (1959, 1960, 1970), першым пасляваенным рэгіянальным слоўніку, прынцыпы адбору і падачы матэрыялу ў ім. Лексіка Мсціслаўшчыны ў працах Г.Юрчанкі "Дыялектны слоўнік" (1966), "Народная сінаніміка" (1969), "Народнае вытворнае слова" (1981, 1983, 1985), "Сучаснае народнае слова" (1988), "Сучасная народная лексіка" (1993, 1996, 1998), "Народнае мудраслоўе" (2002). Гаворкі Бялыніцкага раёна ў слоўніку Р.Яўсеева "Маці казала так…" (1978). "Матэрыялы да абласнога слоўніка Магілёўшчыны" (1981; вып. 2 2005)). Аматарскі слоўнік В.Арцем'ева "Слоўцы-адмыслоўцы: эсэ, абразкі і слоўнік дыялектаў з Ордаці і Радзішына" (2010).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны: "Дыялектны тэматычны слоўнік найменняў іхтыя- і герпетафаўны Беларускага Паазер'я" Т.Грачыхі (2006), "Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны" (2012), "Мова Сенненшчыны", т. 1, 2 (2015).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны. Лексіка Зэльвеншчыны ў "Дыялектным слоўніку" (1970), “Слоўніку народнай мовы Зэльвеншчыны” (2005), "Народнай лексіцы" (1970), "Народнай лексіцы і словаўтварэнні" (1972) П.Сцяцко. Працы Т.Сцяшковіч "Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці" (1972) і "Слоўнік гаворак Гродзенскай вобласці" (1983). Гаворкі Гродзенскага раёна ў слоўніку А.Цыхуна "Скарбы народнай мовы" (1993). "Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны" (1999).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны. "Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны" (1982) Т.Янковай. “Палескі слоўнік” І.Кучука, А.Малюка (2000). Пяцітомны "Тураўскі слоўнік" (1982-1987) – найбольш буйное дасягненне палескай лексікаграфіі. "Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны" (1975-1982). Лексіка перыферыйных беларускіх гаворак у "Словаре народных говоров западной Брянщины" (1973) П.Растаргуева.

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны. "Слоўнік гаворак цэнтральных раёнаў Беларусі" (т.1, 1990) і "Матэрыялы да слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак" (1970, 1974, 1977). Лексіка Лагойшчыны ў слоўніку А.Варлыгі (1970).

Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстчыны. "Дыялектны слоўнік Брэстчыны" (1989), “Слова да слова – будзе мова: Дыялектны слоўнік в. Фядоры” (2010) С.Клундук, “Дыялектны слоўнік Косаўшчыны” (2011) А.Зайкі, “Сказана – звязана” (2013) В.Касцючык, “Альпенскі дыялектны слоўнік” (2004) І.Ляшкевіча, “Мова прадзедаў, мова дзядоў: Дыялектычны слоўнік лабарскай гаворкі” (2006) Я.Шэмет і Г.Валавень, “Палескі архіў” В.Вярэніча (2009).

Пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы).

Збор рэгіянальнай лексікі з розных месцаў Беларусі Л.Шаталавай "Беларускае дыялектнае слова" (1975), Н.Гілевіч “Дыялектны слоўнік”(2005), В.Мілкоўскага “Матчына слова” (выд. 2-е, 2011) і інш.

Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі: "Матэрыялы для слоўніка народна-дыялектнай мовы" (1960), "Полесье" (1968), "Лексика Полесья" (1968), "З народнага слоўніка" (1975), "Народнае слова" (1976), "Народная лексіка" (1977), "Жывое слова" (1978), "Народная словатворчасць" (1979), "Жывое народнае слова" (1992), "Гавораць Чарнобыльцы" (1994), “Жывое наша слова” (2001), “Скарбы народнай мовы” (2005), “Народныя скарбы” (2008), “Беларуская дыялекталогія: Матэрыялы і даследаванні”, вып. 1 (2010); вып. 2 (2012), вып. 3 (2014), вып. 4 (2016), вып. 5 (2018); асобныя публікацыі слоўнічкаў у шматлікіх навуковых, навукова-папулярных, літаратурна-мастацкіх і іншых выданнях.

Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове “Жывёльны свет” (1999), “Раслінны свет” (2001), “Чалавек” (2006), “Сельская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гаспадарка” (2010), “Вопыт літаратурна-дыялектнага слоўніка беларускай мовы” (1999) У.Анічэнкі, “Слоўнік народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” (2010) М.Макарэвіча і інш. як падрыхтоўчы этап для стварэння “зводнага” слоўніка беларускіх гаворак.

Слоўнік-даведнік М.Абабуркі "Дыялектызмы ў творах беларускіх савецкіх пісьменнікаў" (1979).

*6.2. Дыялектная фразеаграфія.* Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і паліць" (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991). “Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны” М.Даніловіча (2000). “Прыказкі і прымаўкі” А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт збору вобразных канструкцый.

**7. Дыялектная аснова літаратурнай мовы.** З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**8. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе.** Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак.

Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі.

Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай.

Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | практычныя заняткі | КСР | | самастойная работа студэнтаў | | | |
| | | | | лекцыі | практычныя | | | | |
| | **БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ (44 гадзіны)** | **18** | **18** | **2** | **4** | **42** | | | |
| **1.** | **УВОДЗІНЫ (1 г.)** | **1** | | | | | | | |
| | 1. Прадмет, змест і задачы курса "Беларуская дыялекталогія", яе месца ў сістэме філалагічнай адукацыі.<br>2. Навукова-тэарэтычнае значэнне дыялекталогіі. Сувязь дыялекталогіі з іншымі навукамі: лінгвістычнымі; нелінгвістычнымі.<br>3. Практычнае значэнне вывучэння дыялекталогіі пры авалоданні нормамі беларускай літаратурнай мовы. Выкарыстанне фактаў дыялекталогіі ў выкладанні курса беларускай мовы ў школе.<br>4. Выхаваўчае значэнне дыялекталогіі ў фарміраванні маўленчай культуры асобы. | 1 | | | | | | [1], [2], [5] | |
| **2.** | **ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ ЯК РАЗДЗЕЛ МОВАЗНАЎСТВА (5 г.)** | **1** | **4** | | | **4** | | | |
| 2.1. | *Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы.*<br>1. Апісальная і гістарычная дыялекталогія.<br>2. Сістэма навуковых паняццяў у дыялекталогіі.<br>3. Тэрытарыяльныя дыялекты. Сацыяльныя дыялекты, сфера іх выкарыстання.<br>4. Асноўныя раздзелы дыялекталогіі, аб’екты іх даследаванняў.<br>5. Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фалькларыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў<br>XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш.<br>6. Метады даследавання дыялектнай мовы. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне. | 1 | | | | | | [2], [3], [4], [5] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 7. Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў. | | | | | | | | |
| | *Дыялектная мова і літаратурная мова – дзве формы існавання нацыянальнай мовы.*<br>1. Тэрытарыяльныя дыялекты. Сацыяльныя дыялекты, сфера іх выкарыстання.<br>2. Асноўныя раздзелы дыялекталогіі, аб’екты іх даследаванняў.<br>3. Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фалькларыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў<br>XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш.<br>4. Метады даследавання дыялектнай мовы. Асаблівасці запісу матэрыялаў па лексіцы, фанетыцы, марфалогіі і сінтаксісе. Апрацоўка сабранага дыялектнага матэрыялу, пашпартызацыя, каталагізацыя і захоўванне.<br>5. Праграмы і інструкцыі для збірання дыялектнага матэрыялу, іх тыпы ў залежнасці ад мэт і задач даследаванняў. | | 2 | | | 2 | | [2], [3], [4], [5] | Апытванне, вусныя паведамлен ні |
| 2.2. | *З гісторыі беларускай дыялекталогіі.*<br>1. Станаўленне і развіццё беларускай дыялекталогіі (XIX – пачатак XX ст.).<br>2. Адлюстраванне асаблівасцей беларускіх гаворак на розных моўных узроўнях у фальклорных і этнаграфічных працах першай паловы XIX ст. Першыя спробы вызначэння межаў беларускай дыялектнай мовы, характарыстыкі і класіфікацыі гаворак у іх працах.<br>3. Апісанне характэрных фанетычных і марфалагічных асаблівасцей беларускіх гаворак, публікацыі асобных мясцовых слоў, падборак фразеалагізмаў і невялікіх слоўнікаў у працах этнографаў і фалькларыстаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.<br>4. Лінгвістычнае даследаванне гаворак беларускай мовы. Значэнне даследаванняў Я.Карскага ў распрацоўцы разнастайных праблем беларускай дыялекталогіі.<br>5. Развіццё беларускай дыялекталогіі ў паслякастрычніцкі перыяд. Камісія Інбелкульта (1925) па ўкладанні слоўніка жывой беларускай мовы і вынікі яе дзейнасці.<br>6. Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд.<br>7. Вывучэнне беларускай дыялектнай мовы замежнымі навукоўцамі.<br>8. Праграмы, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі. | | 2 | | | 2 | | [2], [3], [4], [5] | Рэфераты |
| **3.** | **ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ (4 г.)** | **2** | **2** | | | **8** | | | |
| | 1. Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт. Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны; у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў. Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў.<br>2. З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі. | 2 | | | | | карты, атласы | [2], [3] | |

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Прадмет, змест і задачы лінгвістычнай геаграфіі. Сістэма навуковых паняццяў: праграма (апытальнік), сетка апорных населеных пунктаў, лінгвістычная карта, лінгвістычны атлас, ізаглоса, пучок ізаглосаў, арэал, дыялектная зона. Дыялектныя адрозненні як аб'ект картаграфавання. Тыпы лінгвістычных карт. Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны; у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў. Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў.<br>2. З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). Пасляваенны этап у развіцці беларускай лінгвагеаграфіі. | | 2 | | | 2<br>2<br>2<br>2 | карты, атласы | [2], [3] | Апытванне, рэфераты |
| **4.** | **ГРУПОЎКА БЕЛАРУСКІХ ГАВОРАК (14 г.)** | **6** | **6** | | | **16** | | | |
| 4.1. | *Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў.*<br>1. Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы.<br>2. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны). | 2 | | | | | | [1], [2], [3], [5] | |
| | *Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў.*<br>1. Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы.<br>2. Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і культурна-гістарычны). | | 1 | | | 2<br>2 | | [1], [2], [3], [5] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў |
| 4.2. | *Паўночна-ўсходні дыялект.*<br>1. Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы.<br>2. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская). | 1 | | | | | магнітафонныя запісы | [2], [3], [4] | |
| | *Паўночна-ўсходні дыялект.*<br>1. Тэрыторыя пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы.<br>2. Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская). | | 1 | | | 4 | магнітафонныя запісы | [2], [3], [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.3. | *Паўднёва-заходні дыялект.*<br>1. Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы.<br>2. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце.<br>3. Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі). | 1 | | | | | відэазапіс | [2], [3], [4] | |
| | *Паўднёва-заходні дыялект.*<br>1. Тэрыторыя яго пашырэння, асноўныя фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя і лексічныя рысы.<br>2. Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце.<br>3. Іншы погляд на вывучэнне груп гаворак у складзе дыялектаў: полацка-мінская (полацкая), віцебская і ўсходнемагілёўская групы ў паўночна-ўсходнім дыялекце; гродзенска-баранавіцкая, слуцкая, мазырская, палеская групы ў паўднёва-заходнім дыялекце (А.Крывіцкі). | | 2 | | | 4* | відэазапіс | [2], [3], [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў |
| 4.4. | *Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі.*<br>1. Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.<br>2. Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны. | 2 | | | | | відэазапіс | [2], [3], [4] | |
| | *Сярэднебеларускія (пераходныя) гаворкі.*<br>1. Тэрыторыя пашырэння. Спалучэнне ў іх моўных рыс паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў. Спецыфічныя моўныя рысы сярэднебеларускіх гаворак.<br>2. Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны. | | 2 | | | 4* | відэазапіс | [2], [3], [4] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў |
| **5.** | **БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТНАЯ МОВА (6 г.)** | **4** | **2** | | | **4** | | | |
| 5.1. | *Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка.*<br>1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць.<br>2. Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы.<br>3. Шасціфанемная і васьміфанемная вакалічныя сістэмы беларускай дыялектнай мовы. Тэрытарыяльна абмежаваныя ў гаворках фанемы /ô/ (закрытая) і /ê/ (закрытая), фанетычныя ўмовы іх | 2 | | | | | | [2], [5] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | узнікнення.<br>4. Супрацьпастаўленне санорных /р/ і /р'/, афрыкат /дз'/, /ц'/ і змычных /д(д')/, /т(т')/, шыпячых /ж/ і /ж'/, /ч/ і /ч'/, /ш/ і /ш'/, /дж/ і /дж'/, свісцячых /ц/ і /ц'/ у беларускіх гаворках.<br>5. Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя. Чаргаванне галосных і інш. Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Пазіцыйныя змяненні ненаціскных галосных пад уздзеяннем зычных і галосных суседніх складоў. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Дысімілятыўнае аканне з элементамі асіміляцыі. Поўнае і няпоўнае недысімілятыўнае аканне. Поўнае недысімілятыўнае аканне – арфаэпічная норма беларускай літаратурнай мовы. Оканне. Гіпероканне. Вымаўленне на месцы этымалагічнага [о] гука [у]. Вакалізм пераходнага тыпу. Дысімілятыўна-недысімілятыўнае аканне. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем. Галосныя ў пачатку слова. Адпадзенне галосных і яго прычыны. З'яўленне галосных у пачатку слова. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак у пазіцыі пасля мяккіх зычных. Дысімілятыўнае яканне, віцебскае яканне як яго разнавіднасць. Недысімілятыўнае яканне, поўнае і няпоўнае. Недысімілятыўнае няпоўнае яканне – арфаэпічная норма сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Еканне. Асаблівасці яго праяўлення ў заходнепалескіх гаворках. Рэшткі цокання ў асобных гаворках паўночнага ўсходу Беларусі. Прыстаўныя зычныя /в/, /г/, асаблівасці іх ужывання ў дыялектнай мове. Адсутнасць прыстаўных у некаторых гаворках.<br>6. Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет: варыянтнасць губных; варыянтнасць пярэднеязычных; варыянтнасць заднеязычных; варыянтнасць шумных, аднолькавых паводле спосабу ўтварэння; варыянтнасць санорных; варыянтнасць звонкіх і глухіх зычных; варыянтнасць цвёрдых і мяккіх. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза галосных. Пратэза зычных. Адпадзенне пачатковых фанем. Эпентэза галосных і зычных фанем. Дыярэза галосных, зычных і складоў. Метатэза фанем: метатэза галоснай і зычнай, зычных фанем і складовая. Прыпадабненне звонкіх да глухіх, адсутнасць асіміляцыі звонкіх да глухіх у частцы гаворак. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова, адсутнасць аглушэння ў частцы гаворак. Асіміляцыя шыпячых да свісцячых. | | | | | | | | |
| | *Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Фанетыка.*<br>1. Адзінства беларускай дыялектнай мовы ў асноўных лексіка-граматычных катэгорыях. Сувязь паміж рознымі ўзроўнямі дыялектнай мовы і іх узаемная абумоўленасць.<br>2. Фанетыка. Адзінства асноўных асаблівасцей фанетычнай сістэмы беларускай дыялектнай мовы.<br>3. Рэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Лабіялізацыя. Чаргаванне галосных і інш. Асаблівасці вымаўлення ненаціскных галосных у залежнасці ад фанетычнай пазіцыі. Колькасная і якасная рэдукцыя. Тыпы ненаціскнога вакалізму беларускіх гаворак. Дысімілятыўнае і недысімілятыўнае аканне. Оканне. Гіпероканне. Вакалізм пераходнага тыпу. Змешаны вакалізм з оканнем і аканнем.<br>4. Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза. Эпентэза. Дыярэза. Метатэза. Прыпадабненне. | | 2 | | | 2 | | [2], [5] | Апытванне, пісьмовыя і вусныя практыкаванні, аналіз дыялектных тэкстаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5.2. | *Марфалогія. Сінтаксіс. Лексіка. Фразеалогія.*<br>1. Назоўнік. Адрозненні ў формах роду. Адрозненні ў катэгорыі ліку. Рэшткі формаў парнага ліку назоўнікаў у паўднёва-заходніх гаворках. Скланенне назоўнікаў у адзіночным ліку. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду. Форма клічнага склону. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў жаночага роду. Дыялектныя адрозненні назоўнікаў з суфіксам -онак (-ёнак), якія абазначаюць маладых істот. Скланенне назоўнікаў на -мя, а таксама назоўнікаў *маці, свякроў* у розных гаворках. Асаблівасці скланення назоўнікаў мужчынскага роду на -а (-я). Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Агульнаўжывальныя і дыялектныя канчаткі назоўнікаў.<br>2. Займеннік. Дыялектныя адрозненні ў скланенні займеннікаў. Семантычныя адрозненні і скланенне ўказальных займеннікаў. Склонавыя формы прыналежных займеннікаў. Няпэўныя займеннікі з постфіксамі -сці, -ль, -та, -небудзь і прыстаўкай абы-.<br>3. Прыметнік. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў у беларускіх гаворках. Дыялектныя адрозненні скланення прыметнікаў у адзіночным ліку. Скланенне прыметнікаў у множным ліку. Злітыя канчаткі ў формах прыметнікаў. Утварэнне формаў ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай дыялектнай мове.<br>4. Лічэбнік. Дыялектныя формы ўласна колькасных, зборных і дробавых лічэбнікаў. Асаблівасці скланення колькасных і парадкавых лічэбнікаў у гаворках. Злітыя канчаткі ў парадкавых лічэбніках.<br>5. Дзеяслоў. Формы інфінітыва. Варыянты постфікса -ся ў зваротных дзеясловах: -ся, -сі, -се, -сь -сё, -са, -со, -сэ, -с. Дыялектныя асаблівасці ў асновах дзеясловаў. Дыялектныя адрозненні ў спражэнні дзеясловаў. Формы будучага складанага часу. Сінтэтычная форма. Складаная форма прошлага часу ў гаворках. Дыялектныя адрозненні ў формах загаднага ладу дзеясловаў.<br>6. Прыслоўе. Дыялектныя асаблівасці ў спосабах утварэння прыслоўяў. Дыялектныя асаблівасці ўтварэння ступеней параўнання прыслоўяў.<br>7. Дыялектныя асаблівасці ў складзе і спосабах утварэння прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц.<br>8. Акцэнтныя асаблівасці розных часцін мовы ў беларускіх гаворках.<br>9. Сінтаксіс. Дыялектныя асаблівасці ў структуры словазлучэнняў. Дыялектныя адрозненні ў структуры простага сказа. Дыялектныя адрозненні ў структуры складанага сказа.<br>10. Лексіка. Дыялектныя адрозненні ў лексіцы. Агульнанародныя і дыялектныя словы ў лексіцы беларускіх гаворак. Асноўныя прыкметы дыялектнага слова. Дыялектныя словы ў розных семантычных групах традыцыйнай лексікі. Гістарычныя пласты ў лексіцы сучасных беларускіх гаворак. Запазычаныя словы ў складзе дыялектнай лексікі, іх адаптацыя ў беларускай дыялектнай мове. Асноўныя тыпы дыялектных адрозненняў у лексіцы. Лексіка-семантычныя сувязі ў сістэме гаворак. Полісемія. Аманімія. Сінанімія. Матываванасць дыялектных слоў. Змены ў дыялектнай лексіцы, звязаныя з сучаснымі працэсамі развіцця тэрытарыяльных гаворак.<br>11. Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў. Сінанімічнасць фразеалагізмаў. Полісемія фразеалагізмаў. Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы. | 2 | | | | 2 | | [2], [5] | |
| **6.** | **ДЫЯЛЕКТНАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ І ФРАЗЕАГРАФІЯ (6 г)** | **4** | **2** | | | **12** | | | |
| 6.1. | *Дыялектная лексікаграфія.*<br>1. Дыялектная лексікаграфія (дыялектаграфія) як самастойны раздзел сучаснай беларускай апісальнай дыялекталогіі. Мэты, задачы, прынцыпы і прыёмы навуковага даследавання ў дыялектаграфіі. | 2 | | | | | | [2], [3], [4] | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Тыпы дыялектных слоўнікаў і прынцыпы іх укладання. Дыялектныя слоўнікі поўныя і дыферэнцыйныя. Слоўнікі дыялектызмаў з твораў пісьменнікаў.<br>3. Тры асноўныя этапы ў гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі. Этнаграфічны этап, яго храналагічныя межы і асаблівасці. Этналінгвістычны этап як састаўная частка агульнага апісання беларускай мовы. Дыялектаграфічны этап у гісторыі беларускай дыялектнай лексікаграфіі.<br>4. Развіццё беларускай дыялектнай лексікаграфіі ў другой палове XX ст. – пачатку XXI ст. Асаблівасці лексікаграфічнай праграмы Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі і вынікі яе рэалізацыі.<br>5. Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных рэгіёнах. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстчыны. Пяцітомны "Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы). Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі. Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове. | | | | | 2<br>2<br>2<br>2 | | | |
| 6.2. | *Дыялектная фразеаграфія.*<br>1. Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання.<br>2. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі.<br>3. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і паліць" (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991), "Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны" М.Даніловіча (2000).<br>4. "Прыказкі і прымаўкі" А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. "Слоўнік беларускіх народных параўнанняў" (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый. | 2 | | | | | | [2], [3], [4] | |
| | *Дыялектная фразеаграфія.*<br>1. Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання.<br>2. "Беларуская фразеалогія" (1968) Ф.Янкоўскага – першы беларускі слоўнік дыялектнай фразеалогіі.<br>3. "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" (1972) Е.Мяцельскай і Я.Камароўскага. Тры выпускі фразеалагічнага слоўніка Г.Юрчанкі "І коціцца і валіцца" (1972), "І сячэ і паліць" | | 2 | | | 2* | | [2], [3], [4] | Апытванне, рэфераты |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | (1974), "Слова за слова" (1977) – унікальны ў славянскай фразеаграфіі збор устойлівых словазлучэнняў з адной гаворкі Мсціслаўшчыны. "З народнай фразеалогіі: Дыферэнцыяльны слоўнік" І.Лепешава (1991). “Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны” М.Даніловіча (2000).<br>4. “Прыказкі і прымаўкі” А.Аксамітава (2002) – публікацыя фразеалогіі з архіўных крыніц, рэдкіх выданняў і кафедральных збораў. “Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый. | | | | | 2* | | | |
| **7.** | **ДЫЯЛЕКТНАЯ АСНОВА ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ (3 г)** | | **2** | **1** | **2** | | | | |
| | 1. З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве.<br>2. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст.<br>3. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | | 2 | | | | | [3], [5] | Апытванне, рэфераты |
| | 1. З гісторыі фарміравання нацыянальных літаратурных моў. Значэнне тэрміна “літаратурная мова” ў сучасным мовазнаўстве.<br>2. Асаблівасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 17 – пачатку 20 стст.<br>3. Агульнабеларускія моўныя рысы і іх роля ў стварэнні сучаснай літаратурнай мовы. Важнейшыя асаблівасці паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў у складзе літаратурнай мовы. Значэнне сярэднебеларускіх гаворак у станаўленні літаратурнай мовы і яе нормаў. Дваісты характар нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | | | 1 | 2 | | | [3], [5] | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |
| **8.** | **ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ І ВЫКЛАДАННЕ РОДНАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ Ў ШКОЛЕ (3 г)** | | | **1** | **2** | | | | |
| | 1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.<br>2. Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак.<br>3. Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі.<br>4. Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай.<br>5. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка". | | | 1 | | | | [1], [4], [5] | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.<br>2. Дыферэнцыяльны падыход да выкладання роднай мовы ў дыялектных умовах – асноўнае патрабаванне да працы настаўніка. Сістэматычнае назіранне над мовай вучняў. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы. Папярэджанне дыялектных памылак.<br>3. Назіранні вучняў за дыялектнымі асаблівасцямі мясцовай гаворкі, збор лексічнага матэрыялу і складанне дыялектных мікраслоўнікаў. Назіранні за ўжываннем дыялектызмаў у творах беларускай мастацкай літаратуры. Дыялектызмы ў творах пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў гэтым раёне, вобласці. Запіс і аналіз вучнямі фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя з'явы роднай гаворкі.<br>4. Назіранні школьнікаў за вуснай мовай аднакласнікаў і ўласнай мовай.<br>5. Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка". | | | | 2 | | | [1], [4], [5] | Вусныя паведамленні па тэме, рэфераты |
| | ***Усяго:*** | **18** | **18** | **2** | **4** | **42** | | | |

* Темы прызначаны для навучэнцаў спецыяльнасці 1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Леванцэвіч, Л. В. Беларуская дыялекталогія : вучэб.-метад. комплекс / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 2014. – 156 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Бірыла, А. В. Выбраныя працы / А. В. Бірыла. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 542 с.
2. Блінава, Э. Д. Беларуская дыялекталогія : вучэб. дапам. / Э. Д. Блінава, Е. С. Мяцельская. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1991. – 304 с.
3. Вайтовіч, Н. Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі / Н. Т. Вайтовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1968. – 219 с.
4. Крывіцкі, А. А. Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 294 с.
5. Крывіцкі, А. А. Лінгвагеаграфія / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 309–311.
6. Крывіцкі, А. А. Паўднёва-заходні дыялект / А. А. Крывіцкі // Беларуская мова : энцыклапедыя / пад. рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 415–417.
7. Міхайлаў, П. А. Заходнепалескія гаворкі / П. А. Міхайлаў // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал.: У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [ і інш.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 80–83.
8. Міхайлаў, П. А. З гісторыі групоўкі беларускіх гаворак / П. А. Міхайлаў // Роднае слова. – 2013. – № 3. – С. 23–25.
9. Чарнякевіч, Ю. В. Атлас гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 255 с.
10. Чарнякевіч, Ю. В. Ізаглосы і пучкі ізаглос на картах «Атласа гаворак паўночна-ўсходняй Брэстчыны» / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2016. – № 4. – С. 104–107.
11. Чарнякевіч, Ю. В. Марфалагічная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 4. – С. 43–45.
12. Чарнякевіч, Ю. В. Фанетычная сістэма гаворак жыхароў паўночна-ўсходняй Брэстчыны / Ю. В. Чарнякевіч // Вес. БДПУ. Сер. 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 1. – С. 73–79.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодаць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады, формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя кіруемай самастойнай работы студэнтаў накіравана на вырашэнне наступных **задач**:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

**Крыніцай інфармацыі** пры выкананні студэнтамі кіруемай самастойнай работы могуць выступаць: канспект, друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

**План кіруемай самастойнай работы** прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад **месца і часу правядзення** КСР, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтам дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна **можа прадугледжваць**:

– выкананне самастойных прац;

– выкананне кантрольных прац, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых прац;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя **віды заданняў** для кіруемай самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плану тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– выпіскі з тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для **замацавання і сістэматызацыі ведаў**, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.;

Для **фарміравання ўменняў** выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыятыўных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексійны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыё- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для кіруемай самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод **канкрэтных відаў** самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю). Пазнаваўчая дзейнасць студэнтаў пры выкананні гэтых заданняў выяўляецца ў асэнсаванні, запамінанні і ўзнаўленні вучэбнага матэрыялу і прымяненні яго па ўзоры. Яе асноўная мэта – замацаванне ведаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў.

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосаба з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю). На гэтым узроўні студэнт прымяняе вядомы спосаб, адаптуючы яго да новай сітуацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю). Пры гэтым студэнт самастойна выбірае, якія рысы ён можа вылучыць, у якой паслядоўнасці іх падаць і на якія акцэнтаваць асаблівую ўвагу. Дзякуючы гэтаму, самастойная работа набывае даследчы характар.

Для правядзення **кантролю** самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі;

– залікі па тэмах, па раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы;

– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляць карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г.д.

**Крытэрыямі адзнакі** вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкціроўкі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай работы з’яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні запланаванай работы. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г.з. зрабіць гэтыя недахопы аб’ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Для павышэння якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна на працягу ўсяго тэрміну навучання ў ВНУ прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца супрацоўнікамі кафедры ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі адукацыйнага стандарту.

Матэрыял, рэкамендаваны для самастойнага вывучэння, студэнты павінны атрымліваць ад выкладчыка з першых тыдняў семестра. Матэрыял для самастойнай працы, распрацаваны выкладчыкамі кафедры, можа ўключаць комплексы індывідуальных заданняў па пэўных тэмах, сістэму індывідуальных дамашніх кантрольных работ па тэмах і раздзелах дысцыпліны.

Эфектыўнасць самастойнай працы студэнтаў залежыць ад многіх фактараў. Тут і аптымальны выбраная форма працы, і дакладныя, канкрэтныя ўказанні і рэкамендацыі выкладчыка з наступнай аб'ектыўнай ацэнкай яе вынікаў і, самае важнае, сістэматычнасць і паслядоўнасць у правядзенні такой працы.

Тэксты для самастойнага чытання і вывучэння, канспектавання і рэферыравання, метадычныя ўказанні па напісанні рэферата, кантрольныя тэсты і заданні для самастойнай працы студэнтаў прадстаўлены ў кнізе: Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.

| Модуль | Тэксты для самаст. чытання і вывучэння | Кантрольныя тэксты | Заданні для самаст. работы |
|---|---|---|---|
| Модуль 1. Прадмет і задачы дыялекталогіі | Стр. 11-31, 36-50 | Стр. 51-57 | Стр. 58-60 |
| Модуль 2. Групоўка гаворак на тэрыторыі Беларусі | Стр. 72-88, 97-112, 125-145, 157-172 | Стр. 173-188 | Стр. 189-192 |
| Модуль 3. Заходнепалескія гаворкі як асобны структурны тып | Стр. 196-208, 212-230 | Стр. 231-236 | Стр. 237-238 |

У дапаможніку прадстаўлены тэмы рэфератаў да кожнага практычнага занятку, а таксама падаюцца тэксты для канспектавання і рэфірыравання:

1) І.Я.Яшкін. Узаемадзеянне рознадыялектных сістэм. Мн., 1976, с.28-62;

2) Вайтовіч Н.Т. Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі. Мн., 1968, с. 10-55;

3) М.А.Жыдовіч. Назоўнік у беларускай мове. Мн., 1969, с. 15-44.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

**Тэма 7 Дыялектная аснова літаратурнай мовы – 4 гадзіны (практычныя)**

*Заданне*:

**1 модуль складанасці** – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце план адказаў на пытанні.

1. Ці ёсць адрозненні ў сістэме зычных гаворкі і літаратурнай мовы?.
2. Як перадаюцца ў гаворках пярэднеязычныя санорныя [р] і [р']? Як называюцца такія гаворкі?
3. Як перадаюцца пярэднеязычныя афрыкаты [дз'] — [ц'] і змычныя [д(д')| і [т(т')]?
4. Як перадаюцца пярэднеязычныя шыпячыя [ж], [ч], [ш] і афрыкаты [дж], [ц]?
5. Як перадаюцца губныя фанемы [б] — [б'], [в] — [в'], [м] - [м'], [п] - [п']?
6. Ці ўласцівы фанемы [ф] — [ф'] сістэме кансанантызму беларускай мовы?

**2 модуль складанасці** – выканайце заданні 7-12 з практыкума (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.): складзіце апорныя схемы «Асаблівасці гаворак у склоне», «Асаблівасці гаворак у склоне», «Дыялектныя канчаткі назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку ўсіх тыпаў скланення», запоўніце табліцы «Несупадзенне назоўнікаў у родзе»,«Скланенне рознаскланяльных назоўнікаў».

**3 модуль складанасці** – падрыхтуйце праект «Фанетыка і марфалогія дыялектнай мовы» і абараніце яго.

**Тема 8. Дыялекталогія і выкладанне роднай мовы і літаратуры ў школе – 2 гадзіны (лекцыйныя)**

*Заданне*:

**1 модуль складанасці** – на аснове падручніка (Мяцельская, Е. С. Беларуская дыялекталогія: Практыкум / Е. С. Мяцельская, Э. Д. Блінава. - Мінск, 1991. - 287 с.) складзіце кароткі канспект па пытаннях

1. Дыялектная аснова мовы вучняў і засваенне нормаў літаратурнай мовы.
2. Патрабаванні школьных праграм да культуры вуснай і пісьмовай мовы вучняў.

**2 модуль складанасці** – падрыхтуйце рэферат па адной з прапанаваных тэмаў.

1. Выяўленне і класіфікацыя дыялектных адхіленняў у вуснай і пісьмовай мове.
2. Аналіз памылак, звязаных з уплывам роднай гаворкі.
3. Супастаўленне дыялектных з'яў з адпаведнымі з'явамі літаратурнай мовы.
4. Папярэджанне дыялектных памылак.

**3 модуль складанасці** – падрыхтуйце праект «Арганізацыя ў кабінеце беларускай мовы кутка "Родная гаворка"» і абараніце яго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 2.1. | Крыніцы вывучэння беларускай дыялектнай мовы. Запісы фалькларыстаў, этнографаў XIX – XXI стст., мастацкія творы пачатку фарміравання сучаснай беларускай літаратурнай мовы, матэрыялы дыялектолагаў XIX – XXI стст., дыялектныя слоўнікі, хрэстаматыі вуснага маўлення, лінгвістычныя атласы і інш. | 2 | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 2.2. | Дыялекталагічныя даследаванні беларускіх гаворак у пасляваенны перыяд. | 2 | Падрыхтаваць даклад па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная |
| 3. | Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад моўных узроўняў: а) універсальны, б) тэматычны<br>Тыпы лінгвістычных атласаў у залежнасці ад тэрыторыі даследавання: а) агульнанацыянальны, б) рэгіянальны, в) атласы груп моў, г) сем'яў моў ці кантынентаў<br>Беларускія дыялектныя асаблівасці на картах гэтых атласаў<br>З гісторыі лінгвагеаграфіі (Г.Венкер, Ж.Жыльерон, Я.Карскі, Маскоўская дыялекталагічная камісія, П.Бузук). | 2<br>2<br>2<br>2 | Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Падрыхтаваць даклад (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Вусная<br>Вусная<br>Вусная<br>Вусная |
| 4.1. | Першая спроба падзелу гаворак беларускай мовы на групы. Падзел Я.Карскім беларускай мовы на паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты. Групоўка беларускіх гаворак, зробленая Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй. Пытанні групоўкі гаворак беларускай мовы ў працах М.Дурнаво і П.Бузука. Выдзяленне групы пераходных гаворак паміж дыялектамі беларускай мовы.<br>Сучасная групоўка беларускіх гаворак на аснове матэрыялаў "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы". Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана групоўка (этнагенетычны і | 2<br>2 | Скласці канспект (рэпазіторый)<br>Скласці канспект (рэпазіторый) | Пісьмовая<br>Пісьмовая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | культурна-гістарычны). | | | |
| 4.2. | Групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту: заходняя (полацкая) і ўсходняя (віцебска-магілёўская). | 4 | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 4.3. | Групы гаворак паўднёва-заходняга дыялекту: заходняя (гродзенска-баранавіцкая), усходняя (слуцка-бабруйская) і паўднёвая (палеская). Месца палескай групы гаворак у паўднёва-заходнім дыялекце. | 4* | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 4.4. | Дыялектныя зоны як вынік культурна-гістарычнай еднасці беларускай дыялектнай мовы: паўночна-заходняя, паўднёва-ўсходняя, заходняя, усходняя і цэнтральная. Тыповыя моўныя рысы кожнай дыялектнай зоны. | 4* | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 5. 1. | Нерэгулярныя фанетычныя змены ў беларускай дыялектнай мове. Варыянтнасць зычных на аснове якасных прыкмет. Варыянтнасць галосных на аснове якасных прыкмет. Нерэгулярныя фанетычныя з'вы квалітатыўна-дыстрыбутыўнага характару. Пратэза. Эпентэза. Дыярэза. Метатэза. Прыпадабненне. | 2 | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 5.2. | Фразеалогія. Дыялектныя адрозненні ў фразеалогіі. Агульнапашыраныя і тэрытарыяльна абмежаваныя фразеалагізмы. Прыкметы дыялектных фразеалагізмаў. Сінанімічнасць фразеалагізмаў. Полісемія фразеалагізмаў. Сувязь дыялектнай фразеалогіі з фразеалогіяй літаратурнай мовы. | 2 | Выкананне практыкавання або рэферат (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 6.1. | Вывучэнне лексікі беларускіх гаворак па асобных рэгіёнах. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Магілёўшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Віцебшчыны. Лексікагрфічнае даследаванне гаворак Гродзеншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Гомельшчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Міншчыны. Лексікаграфічнае даследаванне гаворак Брэстчыны. Пяцітомны "Слоўнік беларускіх | 2<br>2<br>2 | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Выкананне практыкавання або рэферат (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Падрыхтаваць прэзентацыю (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая<br>Пісьмовая<br>Вусная |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яго пагранічча" (1979-1986) як новы тып слоўніка ў беларускай дыялектнай лексікаграфіі, што адлюстроўвае слоўнае багацце паўночна-заходняй дыялектнай зоны і беларускіх гаворак за межамі Беларусі (на тэрыторыі Латвіі, Літвы, Польшчы). Зборнікі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў Беларусі. Тэматычныя дыялектныя слоўнікі па беларускай дыялектнай мове. | 2 | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая |
| 6.2. | Слоўнікі беларускай дыялектнай фразеалогіі, прынцыпы іх складання.<br>“Слоўнік беларускіх народных параўнанняў” (2011) як вопыт найбольш поўнага збору вобразных канструкцый. | 2*<br><br>2* | Напісанне рэферата па тэме (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр)<br>Падрыхтаваць прэзентацыю (рэсурсна-інфармацыйны цэнтр) | Пісьмовая<br><br>Вусная |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

Дыягностыка кампетэнцый па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, даклады, вусны аналіз дыялектнага тэксту, вусны залік.

Пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовы аналіз тэксту гаворкі, пісьмовы залік.

Тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КРЫТЭРЫІ І ПАКАЗЧЫКІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ЭКЗАМЕНЕ

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| **10** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам і паказвае яго поўнае разуменне; выяўляе самы высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага, абгрунтавана выкладае свае думкі, выкарыстоўваючы звесткі з дадатковай літаратуры, робіць самастойныя вывады і заключэнні, падмацоўвае свой адказ уласнымі ілюстрацыямі-доказамі. Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Перадае матэрыял паслядоўна, захоўваючы нормы літаратуранай мовы; праяўляе адказнасць, пазнавальную актыўнасць і крэатыўнасць. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **9** | Студэнт свабодна валодае вучэбным матэрыялам, дае поўнае азначэнне лінгвістычным паняццям, выяўляе высокі ўзровень усвядомленасці вывучанага і ўменне аргументавана выкладаць яго, падмацоўвае свой адказ яркімі ілюстрацыямі-доказамі (як з дапаможнікаў, так і самастойна падабранымі). Аналіз моўных фактаў выкананы без памылак, што сведчыць пра ўменне прымяняць тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач навучання. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **8** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме валодае вучэбным матэрыялам, самастойна абгрунтоўвае свой адказ і прыводзіць ілюстрацыі-доказы, узятыя з дапаможнікаў ці лекцый. Пры выкананні аналізу моўных фактаў дапускае асобныя недакладнасці, якія сам жа выпраўляе. Матэрыял выкладае паслядоўна, з захаваннем літаратурных нормаў; не дапускае фактычных памылак. Маўленне адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **7** | Студэнт у дастаткова поўным аб'ёме перадае вучэбны матэрыял з асобнымі недакладнасцямі, якія выпраўляе пасля дадатковых пытанняў; можа абгрунтаваць свой адказ, прывесці ілюстрацыі-доказы; матэрыял выкладае паслядоўна з нязначнымі адхіленнямі ад літаратурнай нормы. Аналіз моўных фактаў выкананы з некаторымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **6** | Студэнт перадае вучэбны матэрыял з нязначнымі памылкамі, але выпраўляе іх з дапамогай выкладчыка; тэарэтычныя звесткі падмацоўвае ілюстрацыямі, але без дастаткова глыбокага і доказнага іх абгрунтавання; дапускае недакладнасці ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу і яго моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з нязначнымі памылкамі, якія выпраўляюцца самастойна. Маўленне ў асноўным адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **5** | Студэнт ў асноўным ведае і разумее галоўныя палажэнні тэмы, але дапускае памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, якія можа выправіць з дапамогай выкладчыка; выкладае матэрыял непаслядоўна; дапускае памылкі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | ў моўным афармленні. Аналіз моўных фактаў выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **4** | Студэнт няпоўна выкладае праграмны вучэбны матэрыял, дапускае асобныя памылкі ў азначэнні паняццяў і фармулёўцы правіл, не ўмее абгрунтаваць свае развaжанні, адчувае цяжкасці пры падборы ілюстрацый; парушае паслядоўнасць выкладу матэрыялу, дапускае памылкі ў моўным афармленні адказу. Моўны аналіз выкананы з памылкамі, якія выпраўляюцца з дапамогай выкладчыка. Маўленне недастаткова лагічнае і выразнае. |
| **3** | Студэнт ўзнаўляе нязначную частку вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы з грубымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **2** | Студэнт называе асобныя моўныя факты з вучэбнага матэрыялу, дапускае істотныя памылкі, якія выпраўляе з дапамогай выкладчыка. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |
| **1** | Студэнт не валодае нават асобнымі фактамі з вучэбнага матэрыялу, не ўсведамляючы іх месца ў агульнай моўнай сістэме. Аналіз моўных фактаў не выкананы або выкананы са значнымі памылкамі. Маўленне не адпавядае патрабаванням лагічнасці, дакладнасці, правільнасці, выразнасці. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пратакол узгаднення рабочай праграмы з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала рабочую праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. Сучасная беларуская літаратурная мова.<br><br>2. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | узгадніць, пратакол № 9 ад 19.04.2019 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ